

Інфармацыйная культурна-грамадская газета Гарадоччыны

ГАСЦІНЕЦ

№ 16 (241) ЛІСТАПАД 2017 ГОДА

БЕЛАРУСКІЯ АФАРЫЗМЫ

Хвала и слава могуць разлучыць, а гора і бяда заўсёды зблізяць

Пімен Панчанка

РЭХА ТРАГЕДЫІ

ВЫЖИВШАЯ ДЕВУШКА ПРИШЛА В СОЗНАНИЕ

Выжившая в ДТП в Городокском районе девушка пришла в сознание, сообщила официальный представитель Следственного комитета Беларуси Юлия Гончарова в эфире «Альфа-радио», информирует БЕЛТА.

«Девушка жива, она пришла в сознание. Следователи пока не допрашивали ее, нужно, чтобы она окрепла. Была только короткая беседа, которая не фиксировалась», — сказала Юлия Гончарова.

Официальный представитель Следственного комитета напомнила, что сообщение о ДТП поступило от бригады скорой медицинской помощи. «Как там оказалась скорая помощь? Автомобиль Volvo S40 совершил обгон скорой медицинской помощи на выезде из деревни, а потом съехал с проезжей части в кювет и врезался в дерево», — добавила она. Водитель скорой не видел момента ДТП, Volvo после обгона быстро скрылся из виду.

По словам Юлии Гончаровой, говорить о том, что водитель был пьян, нельзя ни в коем случае. «Перед экспертами поставлено множество вопросов, в том числе и кто находился за рулем. Сразу по картине с места происшествия понять этого было нельзя. По наличию алкогольного или наркотического опьянения погибших тоже назначены экспертные исследования. Ожидаем результаты по всем участникам. Еще хочу уточнить, что информация о том, что девушка сидела впереди на коленях и осталась поэтому жива, абсолютно не соответствует действительности. Об этом могут сказать только свидетели, которых мы ищем», — пояснила официальный представитель Следственного комитета.

Как сообщалось, 5 ноября около 22.40 в дежурную часть ГАИ УВД Витебского облисполкома поступило сообщение, что на 19-м км автодороги М8 возле деревни Дрожаки легковой автомобиль Volvo S40 врезался в дерево, его разорвало на две части. На место аварии незамедлительно выбыли следователи УСК по Витебской области, а также следователи центрального аппарата ведомства. Работу следователей на месте происшествия координировал начальник УСК по Витебской области Владимир Шалухин. Возбуждено уголовное дело по ч.5 ст.317 УК Беларуси (нарушение правил дорожного движения или эксплуатации транспортных средств лицом, управляющим транспортным средством, повлекшее по неосторожности смерть двух и более лиц).

Следователи совместно с экспертами управления Госкомитета судэкспертиз по Витебской области работали на месте, используя возможности передвижной криминалистической лаборатории, а также осветительной установки «Световая башня», которая позволяет проводить осмотр места происшествия в любое время суток.

По предварительной информации, автомобиль Volvo S40 двигался в направлении г.п.Езерище со стороны д.Бычиха. В салоне находилось шесть человек: четверо мужчин (жители Езерища) и две женщины (жительницы одной из деревень Городокского района). 23-летний, 24-летний, 26-летний, 30-летний мужчины и 19-летняя девушка погибли на месте аварии. 21-летняя девушка с тяжкими телесными повреждениями доставлена в учреждение здравоохранения.

БЕЛТА

ЗНАЧНА БОЛЬШ НАВІНАЎ ПРА ГАРАДОК НА HARADOK.INFO

ДАЎГАБУД

ПАДАРУНКА НЕ АТРЫМАЛАСЯ

Набліжаецца да завяршэння будаўніцтва басейна — самы доўгі даўгабуд Гарадка, які вядзецца ўжо больш 25 гадоў. Абяцанне увесці басейн на пачатку лістапада было дадзена на пачатку года.

Раённая газета «Гарадоцкі веснік»упершынюмарызагэты год ад 6 студзеня паведаміла, што на пасяджэнні штаба па будаўніцтву басейна старшыня Віцебскага аблсавета У. Цярэнцьеўінамеснікстаршыні аблвыканкаму У. Белавус падкрэслілі, што ўрачыстае адкрыццё басейна павінна адбыцца не пазней 7 лістапада (ад рэд. — чырвоная дата кастрычніцкага перавароту ў Расіі ў 1917 годзе, які прывёў да чырвонага тэрору і сталінскіх рэпрэсій) гэтага году. Дзеля гэтага завяршэння будаўніцтва з абласной інвестпраграмы на 2017 год выдзелена каля 2,3 млн. руб. да тых 500 тысяч, якія былі асвоены ў апошнім квартале мінулага году.

У гэтым годзе працы на басейне вяліся бесперапынна, як з удзелам будаўнікоў генпадрадчыка ААТ «Будтрэст № 9», будупраўленняў № 38, № 39, так і субпадрадчыкаў, у тым ліку і Гарадоцкай ПМК-51. Будаўнікі прылагаюць намаганні, каб у рэшце-рэшт завяршыць даўгабу басейна, які будзе даўжынёй 25 метраў для чатырох дарожак і трыбунай для гледачоў.

У сярэдзіне кастрычніка каля басейна завяршылася добраўпарадкаванне і былі вывекзены вагончыкі дл ябудаўніцтва,анабасейнез'явіўся надпіс «ФОК». Толькі завяршыць пусканаладачную працу да 7 лістапада не атрымалася і ўрачыста адкрыюць басейн мо ў другой палове лістападу.

Безумоўна басейн доўгачаканы аб'ект для аматараў здаровага ладу жыцця. І відавочна, яго эфектыўнае выкарыстанне будзе залежыць ад таго ці на 100% будзе яго загрузка. А яна будзе залежыць у сваю чаргу ці будуць «падымальнымі» кошты абанентаў у басейн для сярэднестатыстычнага жыхара Гарадоччыны. Раней коштавая палітыка Віцебскага ЦАР па зімовых відах спорту выклікала пытанні, як на лыжаролетнай трасе, так і на ФАКе.

Леанід Гаравы

ЗБЫТ ПРАДУКЦЫІ

ПРАДУКЦЫЯ НЕ ЗНАХОДЗІЦЬ ЗБЫТУ

У гэтым годзе рэзка павялічыліся запасы гатовай прадукцыі — амаль у чатыры разы на складах прамысловых прадпрыемстваў Гарадоччыны ў суадносінах да аб'ёмаў месячнай вытворчасці.

Паводле афіцыйных даных Нацыянальнага статыстычнага камітэту ў верасні месяцы запасы гатовай прадукцыі на складах прамысловых прадпрыемстваў Гарадоччыны дасягнулі 92,4% ад аб'ёму сярэднемесячнай вытворчасці. Фактычна ўжо амаль месяц магчыма не працаваць, каб рэалізаваць існуючыя запасы.

Такі сумны малюнак узнік амаль упершыню, бо ў мінулым годзе па выніках трэцяга квартала запасы прадукцыі складалі толькі 23,4% ад аб'ёму месячнайвытворчасці.Аўгэтым годзе фактычна павялічыліся ў чатыры разы. Такія высокія працэнты запасаў склаліся не ў апошнюю чаргу ў сувязі са значным скарачэннем аб'ёма прамысловай вытворчасці: калі ў мінулым годзе за тры кварталы было выраблена прадукцыі на 17,9 млн. руб., то ў гэтым годзе толькі на 10,9 млн. руб. – менш на 39%.

Але такая кепская сітуацыя не толькі ў Гарадоцкім раёне – яна існуе і ў суседніх раёнах у яшчэ большых памерах. Так запасы гатовай прадукцыі прамысловасці ў Шумілінскім раёне дасягнулі 100,4% пры 14,8% раней (рост амаль у 7 разоў). А ў Віцебскім раёне наогул адбылося затаварванне складоў, бо запасы дасягнулі 240%(прымінулагоднімузроўні ў 40%) ад аб'ёма штомесячнай вытворчасці. Фактычна могуць прадпрыемствы Віцебскага раёна не працаваць больш двух месяцаў.

Такая сітуацыя на ўсходзе вобласці крыху дзіўная, бо ў самой Віцебскай вобласці гэты паказчык толькі 39% і з'яўляецца адным з самых нізкіх у краіне.

Л. Антонаў

ГАНДАЛЬ

АДЧЫНЕЦЦА ТРЭЦЦЯЯ КРАМА «ЕЎРАОПТУ»?

Па вул. Вароўскага насупраць краязнаўчага музея хутчэй за ўсё адчынецца трэцяя крама «Еўраопту», бо будаўнічы цэнтр "Куруш" фактычна спыніў працу.

Нагадаем, што дзесьці гадоў дзесяць таму былая крама культтавары ў самым цэнтры Гарадка, пасля амаль дзесяцігоддзя прастою, была набыта мясцовым прадпрымальнікам, які назваў краму «Будаўнічы цэнтр «Куруш».Івось крама перастала прыносіць жадаемыя прыбыткі і яе гаспадары арганізавалі распродаж. Па нашай інфармацыі галоўным прэтэндэнтам на гэтае прывабнае гандлёвае месца з'яўляецца гандлёвая сетка «Еўраторг». Менавіта яна і размясціла на нязначны час на дзвярах крамы аб'ву аб наборы персаналу для працы ў трэцяй краме «Еўраопта» ў Гарадку.

І даволі хутка паперкі з тэлефонам структуры былі разабраны. Асноўнае пытанне якое зараз вырашаецца паміж гаспадарамі вышэй названых струтур — на якіх умовах будзе адкрыта крама «Еўраопту»: на правах арэнды, як дзве папярэднія крамы або праз продаж гаспадарам «Еўраторгу». А калі дамовы не будзе, то магчымы і іншыя варыянты.

Л. Антонаў

Аб'ява

Аператыўная інфармацыя аб падзеях Гарадоччыны, рэгіёна і больш, чым у газеце, зараз па-беларуску і па-расейску з'яўляецца на новым Інтэрнэт рэсурсе: http://haradok.info

****

Наша газета "Гасцінец" пачала размяшчацца на партале http://haradok.info ў раздзеле "Газета "Гасцінец", дзе ствараецца архіў за мінулыя гады.

****

Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Гасцінец» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – і вы яго атрымаеце. Калі ўжо не жадаеце атрымліваць выданне, то патэлефануйце у рэдакцыю.

АХОВА ПРЫРОДЫ

ПОМНІКАЎ ПРЫРОДЫ АХОЎВАЮЦЦА З ПАРУШЭННЯМІ

Выяўлена 55 парушэнняў рэжыму аховы і выкарыстання помнікаў прыроды – гэта больш паловы афіцына ахоўваемых помнікаў.

Так, у межах батанічнага заказніка мясцовага значэння «Дуброва» Гарадоцкага раёна ўстаноўлены факт самавольнага размяшчэння трох гаражоў, якія належаць філіялу "Турысцка-аздараўленчы комплекс» Лосвіда «УП» Віцебсктурыст".

На тэрыторыі помніка прыроды рэспубліканскага значэння „Цар-Дуб Тадулінскі" Лепельскага раёна выяўлена несанкцыянаванае вогнішча. Несанкцыянаванае развядзенне вогнішчаў таксама ўстаноўлена на тэрыторыі помніка прыроды мясцовага значэння "Гара Замак Варонічская" Полацкага раёна.

Не былі ўстаноўлены інфармацыйныя знакі, прызначаныя для інфармавання насельніцтва і іншых прыродакарыстальнікаў аб межах і рэжыме аховы і выкарыстання на тэрыторыі помнікаў прыроды рэспубліканскага значэння: валун „Хартоўскі" Гарадоцкага раёна, „Млынок" і „Рачныя" Докшыцкага раёна, „Камаў пагорак Валатоўкі" Полацкага раёна, „Гара Лысая", „Гара Маяк" Пастаўскага раёна.

Таксама, адсутнічалі інфармацыйныя знакі ў ахоўнай зоне помнікаў прыроды мясцовага значэння: "Сядзібны комплекс у н.п. Дабрыгоры" Бешанковіцкага раёна, крыніца ва ўрочышчы "Пятроўшчына", старадаўні парк "Сар'янскі", старадаўні парк "Асвейскі", "Сар'янскага нізіна", "Асвейская даліна прарыву" Верхнядзвінскага раёна, "Гара Замак Вароніцкая", "Гомельская крыніца", "Гара Падлозенка Гомельская", "Гара Гарадок Замошская" Полацкага раёна, "Жуперская Града", "Гара Вялікая", "Шчарбішскія крыніцы" Пастаўскага раёна, гара "Фядотава", "Месточковая даліна", "Быстрыцкая даліна", "Града Зінкевіча", "Вялікі камень" Шаркаўшчынскага раёна.

Патрабавалася замена інфармацыйных знакаў у ахоўных зонах помнікаў прыроды размешчаных на землях ГПУ „Нацыянальны парк „Браслаўскія азёры", ААТ "Альшанка", ААТ "Агравідзы", ААТ "Бярозавы край", Ахрэмавіцкі, Мяжанскі і Слабодкаўскі сельвыканкам Браслаўскага раёна, агаленне "Пашына", валун "Пашынскі-1", валун "Пашынскі –2", "Рудакоў роў", парак "Мядзведскі", парк "Высокая", "Кабелякскія парогі", "Краснахарькаўская даліна»" Аршанскага раёна, "Змеяў камень", "Камоид Чарэі", "Крыніца Іезус" Чашніцкага раёна.

За парушэнне рэжыму аховы і выкарыстання, асабліва ахоўных прыродных тэрыторый прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці толькі 6 парушальнікаў заканадаўства, накладзена штрафаў на суму 621 рубель.

Па выніках кантрольных мерапрыемстваў 55 землекарыстальнікам выдадзены рэкамендацыі і інфармацыйныя лісты аб ліквідацыі парушэнняў.

Т. Гаражанка

ЗДАРЭННЕ

ТРИ РАЗА УГОНЯЛИ ОДНИ И ТЕ ЖЕ «ЖИГУЛИ»

Владелец машины даже не закрывает ее на замок и оставляет на неохраняемой территории, на пригорке напротив дома.

В городском поселке Езерище Городокского района третий раз пытаются угнать один и тот же автомобиль. Последняя попытка случилась в сентябре. Хозяин машины около трех часов ночи заметил, что автомобиля нет на том месте, где он его припарковал. Мужчина нашел машину чуть поодаль. Стекло в передней пассажирской двери было разбито, а в салоне лежал парень, прикрывая лицо руками. Хозяин авто обратился в милицию. По факту попытки угона автомобиля возбудили уголовное дело, подозреваемые — двое 17-летних парней.

Интересно, что ранее этот автомобиль уже дважды угоняли. Не то чтобы машина чем-то особенно выделяется. Просто ее хозяин не слишком озабочен безопасностью своего авто.

— Владелец автомобиля оставляет его на неохраняемой территории, на пригорке напротив дома. Машина не оборудована сигнализацией и двери не всегда закрываются на замки, — рассказала официальный представитель УСК по Витебской области Светлана Сахарова. — С потерпевшим проведена профилактическая беседа.

Наталья Партолина
"КП"

КАЛЯ СПОРТУ

КИННУНЕН: «Я ВЗРОСЛЫЙ ЧЕЛОВЕК И ПОНИМАЮ: Я БЕЛОРУСКА, И ТОЧКА»

Анастасия Киннунен (Дуборезова) — призер эстафет на этапах Кубка мира по биатлону и молодая мама. Прошлым летом белоруска вышла замуж за финна Ари Киннунена, а в августе этого года родила дочь Софию-Луми (в переводе с финского — «снег»). Теперь Анастасия живет на две страны и привыкает к скандинавской жизни в стиле «хюгге». Биатлонистка рассказала SPORT.TUT.BY, почему белорусский биатлон будет жив даже без Домрачевой и Блашко и за что муж прозвал ее спайдервумен.

О статусе спайдервумен

Мы познакомились с будущим мужем Ари в Контиолахти. Он подошел после одной из тренировок и заговорил со мной. Часто бывает, что кто-то из представителей спорткомплекса или болельщиков обращается к нам, и если есть минутка, я всегда рада поддержать беседу. Я не знала, кто такой Ари: например, он мог оказаться работником, который готовил нам снег. Почему бы не остановиться и не поблагодарить? Правда, предположение не сработало — он не из сферы спорта (Ари Киннунен работает в страховой компании. — SPORT.TUT.BY). Мы перекинулись парой слов, не более того. А потом Ари нашел меня в соцсетях. Он подметил, что наши биатлонные костюмы напоминают ему спайдерменов. Я сказала: «Давай сойдемся хотя бы на спайдервумен»…

О голубоглазых финнах, которые любят баню и лес

Та часть Скандинавии, откуда мой муж, находится не слишком далеко от Беларуси, чтобы говорить об огромной разнице в менталитете. Я живу в Северной Карелии, рядом с Санкт-Петербургом. У жителей этой части Финляндии есть что-то от русских, что-то — от европейцев. Возможно, меня бы поразил уклад жизни на крайнем севере Финляндии, но в Северной Карелии ощущаю себя почти как дома. Наши друзья-финны достаточно общительные, хотя в целом этот народ называют неразговорчивым. Они любят национальные праздники — масштабно отмечают Рождество и Юханнус (аналог нашего Купалья). Стереотипно считается, что типичный финн — это блондин с голубыми глазами, любящий баню и лес. Что ж, мой муж Ари полностью подходит под это описание.

О белорусских дизайнерах и скандинавском стиле

Свадебное платье искала именно нашего производства — не хотела выходить замуж в наряде, пошитом в Китае. В Беларуси много талантливых людей, и мне всегда приятно, что моя одежда изготовлена белорусскими руками…

Мне совсем не хочется казаться в Финляндии своей, я взрослый человек и понимаю: я белоруска, и точка. Мои финские друзья с интересом спрашивают про белорусскую культуру и религию, а я приглашаю их в гости. Оказывается, многих наших традиций я даже не знала. Все-таки спорт занимает большую часть жизни, поэтому не хватает времени, чтобы вникать в какие-то традиции, кроме семейных.

Скандинавский образ жизни изменил во мне не так и много, разве что — стиль в одежде. Теперь выбираю спортивный вариант не только на тренировки, но и по будням. А еще с удовольствием утепляюсь вязаными носками — здесь погода этому очень способствует. Хотя я люблю и белорусских дизайнеров.

О финском языке и материнстве

Если бы не знала английского, то уже давно освоила бы финский. А так понимаю, что нет большой необходимости ускоренно изучать этот язык. Знаю женщину из Таиланда, которая переехала в Финляндию, не владея ни английским, ни даже латинским алфавитом. Она все быстро освоила — «впитала» новые знания, как ребенок.

Какое-то время я ходила в языковую школу, а сейчас учу финский самостоятельно — все-таки второй язык моей дочери. Муж не совсем понимает, почему ему надо учить русский, а не белорусский. Мы договорились, что поначалу Ари будет общаться с дочкой на финском, а я — на русском. Назвали дочку Софией-Луми. Ее финское имя переводится как «снег». Конечно, это символично для меня. Кстати, в Финляндии много имен, которые одновременно являются нарицательными существительными.

О биатлонной семье и Клаусе Зиберте

После замужества Кайса Макарайнен написала мне: «Добро пожаловать в финскую семью!». Меня радует приятное общение со спортсменами самых разных сборных. Мы с белорусской командой с удовольствием ходили на медиаужины и легкие пати после окончания сезона. В биатлоне точно есть международный семейный клуб.

Клаус Зиберт помог белорусам стать частью интернациональной биатлонной семьи. Он учил нас морально не напрягаться и выезжать на гонки с холодной головой. Клаус любил повторять: «Relax and concentrate — расслабься и соберись!». До Клауса наш биатлон был немного похож на армию: «Встал, пошел!». Тренеры из постсоветского пространства иногда не до конца понимают, что результаты нужны не только им, а в первую очередь нам. Спортсмены — взрослые люди, которые должны прислушиваться к собственным ощущениям. Зиберт умел найти баланс и поддерживал биатлонистов в их мыслях и чувствах. Он не давил на нас, а повторял: «Биатлон — это большая игра. Когда ты расслабляешься, именно тогда все и получается»…

О возвращении в большой спорт

Я не могу смотреть соревнования, сидя у телевизора. Хочется на трассу и участвовать в гонках. В то же время уже не мечтаю о кочевой жизни со сборами по 20 дней, потому что теперь есть семейные будни — теплые и очень интересные. Мне уютно от скандинавской жизни в стиле «хюгге» — булочек, камина и красоты вокруг.

Конечно, приятно вспомнить свою карьеру и спортивное детство. Недавно приезжала к маме в Беларусь и каталась там на лыжероллерах, а когда-то трава вдоль этих дорожек была выше меня. Вторую половину прошлого сезона я уже не выступала и поддерживала отношения с командой только по телефону и интернету. Перед этапом в Контиолахти девочки из белорусской сборной приезжали к нам в гости. Теперь у нас есть общая тема для разговоров — дети.

Вернусь ли в большой спорт? Покажет время. Я стала мамой немного двух месяцев назад, поэтому пока еще не приступила к полноценным тренировкам. В октябре планирую встать на снег, а дальше будет ясно, смогу ли вернуться на уровень Кубка мира. Даша Домрачева сумела выиграть медаль на чемпионате мира спустя четыре месяца после рождения ребенка. Почему нет? Хотя я бы не стала нас сравнивать. Биатлон — интереснейший спорт, и Даша умеет в него красиво играть.

(скарочана)

Виктория Ковальчук
SPORT.TUT.BY

ДЭКРЭТ №3

«ТУНЕЯДЦЫ» БУДУТ ПЛАТИТЬ ПО ПОЛНОЙ... СТОИМОСТИ

Обновленный декрет № 3 предполагает возмещение «тунеядцами» полной стоимости льготируемых государством услуг.



Новая редакция проекта декрета № 3 «О предупреждении социального иждивенчества», который теперь называется «О содействии занятости», подразумевает, что граждане, признанные социальными иждивенцами, должны будут возмещать полную стоимость льготируемых государством услуг. Об этом журналистам сообщила 9 ноября в Палате представителей министр труда Ирина Костевич.

По ее словам, проект обновленного декрета находится на рассмотрении в Администрации президента. «Секретов никаких нет. Уже неоднократно мы говорили, что обновленная версия декрета № 3 направлена прежде всего на содействие и стимулирование занятости, на активную политику занятости по отношению к тем гражданам, которые хотят работать», — сказала министр.

На вопрос, как планируется стимулировать тех, кого признают «тунеядцами», Костевич ответила: «Я не знаю по поводу тунеядцев и не хочу произносить эти слова. Но прежде всего обновленный декрет № 3 направлен, в том числе, и на выход из тени тех, кто занимается скрытой занятостью. Чтобы действительно вывести этих людей на рынок труда, мы планируем полное возмещение тех затрат, которые сегодня льготируются со стороны государства».

«Какие это будут услуги, будет еще рассматриваться», — добавила министр.

Замминистра труда: новая редакция декрета № 3 направлена на обеспечение занятости, а не на уплату какого-то сбора

Декрет № 3 «О предупреждении социального иждивенчества» был подписан Александром Лукашенко 2 апреля 2015 года. Он обязывал граждан Беларуси, постоянно проживающих на территории страны иностранных граждан и лиц без гражданства, которые не участвовали в финансировании государственных расходов или участвовали в таком финансировании менее 183 календарных дней в году, уплачивать сбор в 20 базовых величин. Иначе им грозил штраф либо административный арест, напоминает БелаПАН.

Срок уплаты сбора истек 20 февраля 2017 года. По данным Министерства по налогам и сборам, сбор уплатили более 54 тыс. человек из 470 тыс., которым были разосланы уведомления.

Декрет вызвал возмущение в обществе и привел к массовым уличным протестам, пик которых пришелся на весну этого года.

В начале июля Лукашенко распорядился начать возврат сбора, уплаченного по декрету, но деньги возвращают только тем, кто смог трудоустроиться. На совещании 3 августа он подчеркнул, что «никакой отмены декрета № 3 быть не может» — речь идет о новой редакции этого документа. Глава государства поручил правительству подготовить обновленный вариант к 1 октября. 2 октября стало известно, что доработанный вариант декрета № 3 направлен на рассмотрение президента.

Алексей АЛЕКСАНДРОВ
http://naviny.by

НАША ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ

ЦІ КАСТРЫЧНІК ПРЫДУМАЎ БЕЛАРУСКУЮ ДЗЯРЖАВУ?

Майму карэктнаму калегу Валеру Карбалевічу цяжка спрачацца з тым фактам, што «без Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускай дзяржаўнасьці не было б» — гэта Валер цытуе кагосьці зь дзяржаўных ідэолягаў.

«Існаваньне БССР у складзе СССР, — піша Валер ужо ад сябе, — спрыяла фармаваньню беларускага этнасу, нацыянальнай ідэнтыфікацыі».

Думка ня новая. Настолькі ня новая, што быццам і даказваць ня трэба. І так усім ясна. «Падабаецца гэта каму-небудзь ці не, гэта факт», — настойвае цытаваны Валерам ідэоляг.

А як можа не падабацца, калі тым, каму не падабаецца, усё мінулае стагодзьдзе рот закрывалі аднымаргумэнтам — сырой зямлёй. І паўтаралі свой «факт» з пакаленьня ў пакаленьне. Бо нічога, апроч паўтарэньня, у іх не было.

Сёньня праўда, а яна адваротная, падмацаваная аргумэнтамі, прагучала ўжо шмат разоў. Але праваднікі «постпраўды» стаяць на сваім: беларусаў прыдумаў Кастрычнік.

Пачнем з Кастрычніка, безь якога «не было б беларускай дзяржаўнасьці».

Усе сучасныя нацыі сфармаваліся ў XIX стагодзьдзі. Беларусы тут не выключэньне. Гэта тыповы працэс для ўсіх. Спачатку ўзьнікае нацыянальная ідэя (а гэта ўласна і ёсьць ідэя сваёй нацыянальнай дзяржавы), вакол ідэі фармуецца нацыя. Урэшце нацыя здабывае гэтую самую дзяржаўнасьць. І па тэрмінах гэты працэс у эўрапейскіх народаў адбываўся больш-менш сынхронна, што ў беларусаў, што ў фінаў ці немцаў.

Беларуская нацыянальная ідэя ўзьнікла ў асяродзьдзі студэнтаў Віленскага ўнівэрсытэту, аб'яднаных у таварыства філяматаў-філярэтаў. Гэта 1817 год. Вось бы нам што сёлета адзначаць, а не Кастрычнік.

Далей на працягу XIX стагодзьдзя праз асьветную працу пад шалёным прэсінгам з боку расейскіх акупантаў (успомніце, што стала зь філяматамі) і паўстаньні супраць гэтых самых акупантаў, масавыя рэпрэсіі і супраціў цынічнай русіфікацыі краю (тысячы герояў аддалі сваё жыцьцё, здароўе і свабоду за гэтую ідэю) беларуская ідэя дабралася да 1897 году — першага імпэрскага перапісу насельніцтва, дзе беларускую мову назвалі сваёй 6 мільёнаў чалавек. Іх што, Ленін за язык цягнуў? З Шушанскага. Але менавіта гэты год (сёлета таксама круглая дата) можна лічыць годам, калі сфармавалася беларуская нацыя. За 20 гадоў да Кастрычніка.

Гэтай падзеі папярэднічала зьяўленьне на сьвет маніфэсту Францішка Багушэвіча ў 1891 годзе:

«Можа, хто спытае: дзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, дзе наша мова жывецьць: яна ад Вільні да Мазыра, ад Віцебска за малым не да Чарнігава, дзе Гродна, Менск, Магілёў, Вільня і шмат мястэчкаў і вёсак...»

Пачынаючы з 1906 году — як з рогу ўсяго многа — беларускія газэты, школы, партыі, царква, тэатры...

Усё, між, іншым, як ва ўсіх — у літоўцаў, палякаў, чэхаў. І як ва ўсіх, у 1918 годзе — абвяшчэньне незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Але якім тут бокам Кастрычнік? А вось якім.

25 кастрычніка 1917 году бальшавікі захопліваюць у Расеі ўладу.

У сьнежні 1917-га ў Менску зьбіраецца прадстаўнічы Ўсебеларускі кангрэс — больш за тысячу дэлегатаў ад усіх беларускіх арганізацый і рэгіёнаў. Кангрэс пастанаўляе аб'явсьціць Беларусь незалежнай дзяржавай. У залю ўрываюцца расейскія бальшавікі і разганяюць кангрэс. Але застаецца Рада кангрэсу, якая працягвае працаваць і 25 сакавіка 1918 году абвяшчае Беларусь незалежнай дзяржавай. У краіне ідзе вайна, Менск акупаваны немцамі. А што Кастрычнік? Бальшавікі зноў захопліваюць Менск і выцясьняюць Урад БНР спачатку ў Горадню, пасьля ў эміграцыю. Праўда, нікуды не ўдаецца выцесьніць легітымнасьць Ураду і яго рашэньняў. Каб неяк справіцца з гэтым, бальшавікі аб'яўляюць сваю ССРБ — цалкам падначаленую Маскве рэспубліку, чым дасягаюцца дзьве мэты: змазаць эфэкт агрэсіі і акупацыі, а таксама зрабіць народу прышчэпку кароўскай воспы — ад дзяржаўнасьці.

А што, дарэчы, народ? 500 антыбальшавіцкіх паўстаньняў па ўсёй краіне, найбуйнейшае зь якіх адбываецца на Случчыне. Ізноў бязьмежнае мора забітых, інтэрнаваных, выселеных, выціснутых у эміграцыю.

Цяпер пра спрыяньне Кастрычніка «фармаваньню беларускага этнасу і нацыянальнай ідэнтыфікацыі». Па-першае, навошта фармаваць тое, што ўжо сфармаванае (хіба што не табою). Па-другое, «беларусізацыя» 1920-х была ілюзорнай і правакацыйнай — каб заявіла пра сябе новая нацыянальная эліта, каб у 1930-я ўсю яе татальна пусьціць пад нож. А далей усё «фармаваньне» зводзілася да таго, каб трымаць беларушчыну ў рамках дэкаратыўнага арнамэнту на сьцягу. Варта дадаць, што пры Машэраве ў беларускіх гарадах былі закрытыя ўсе да адной беларускія школы.

Прыведзеныя мною факты ёсьць у адкрытым доступе. Але іх давядзецца яшчэ доўга паўтараць, пакуль яны ня зьявяцца ў школьных падручніках і тэзіс пра стварэньне бальшавікамі беларускай дзяржаўнасьці ня кане ў лету.

Што да саміх трансьлятараў Кастрычніцкага пазытыву для Беларусі, дык варта ўсьведамляць, што гэты тэзіс — ня што іншае як стэрэатып расейскае правінцыі і прадукт рабскае псыхалёгіі, якую расейская імпэрыя заўсёды ўкараняла на захопленых землях. Насамрэч беларусы паводле сваіх нацыянальных кандыцыяў нічым ня горшыя за французаў ці чэхаў ці нарвэжцаў. Проста ніхто зь першых крокаў жыцьця не выхоўвае ў іх нацыянальнае і чалавечае годнасьці. «Падабаецца гэта каму ці не».

У 1980 годзе Сяржук Сокалаў-Воюш на маіх вачах на каленцы напісаў пра ўсё гэта верш:

Мая... Не мая? Мая!
Вам спрэчкай мяне ня здолець.
Бо праўды ад маскальля
Ня мушу пачуць ніколі.
Гісторыю нашу ўшчэнт
Разьнесьлі. У сілы права.
І нейкі сьляпы дацэнт
Адмовіў маю дзяржаву.
Казаў ён: кім вы былі,
Пакуль не прыйшоў
Кастрычнік?
Казаў, што на маскальлі
Трымаўся шчэ наш язычнік...
Ды толькі ня ўцяміў ён,
Што іншыя нашы крылы,
Яшчэ ад часоў плямён,
Яшчэ ад часоў Ярылы.
Віншую цябе, Беларусь,
Зь вялікім тысячагодзьдзем.
Няхай скаланецца хлус,
Бо праўда жыве ў народзе.

Сяргей Дубавец
«Радыё Свабода»

НАША ЎЛАДА

ЗАРОБАК ЧЫНОЎНІКАЎ ДЭМАНСТРУЕ РЭКОРДНЫ РОСТ

За год намінальная зарплата ў органах дзяржкіравання вырасла на 37,1%, рэальная — на 30,8%. Сярод усіх відаў дзейнасці ў Беларусі, у чыноўнікаў — максімальны рост зарплаты.

У Беларусі заработная плата чыноўнікаў дэманструе рэкордны рост. Паводле звестак Белстата, у верасні гэтага года намінальная зарплата работнікаў у сферы дзяржкіравання склала 1.084 рублі, тады як у верасні мінулага — 790,4. Такім чынам, за год намінальная зарплата ў органах дзяржкіравання вырасла на 37,1%, рэальная — на 30,8%.

Гэта максімальны рост зарплаты сярод усіх відаў дзейнасці ў краіне, пры тым што ўзровень заробкаў чыноўнікаў на 30,4% вышэйшы, чым у сярэднім па Беларусі.

Так, рэальная зарплата ў верасні 2017 года да верасня мінулага вырасла: на 19,4% — у машынабудаванні, на 13% — у металургіі, на 11% — у сельскай, лясной і рыбнай гаспадарцы, на 10% — у авіяцыі.

У некаторых відах дзейнасці яна знізілася: у паліграфіі — на 2,4%, страхаванні — на 2,2%, у дапаможнай дзейнасці паветранага транспарту — на 1,9%.

Рэальная зарплата ў бюджэтных арганізацыях у студзені—верасні 2017 года ў параўнанні з адпаведным перыядам 2016 года павялічылася на 1,3%, у верасні 2017 года ў параўнанні са жніўнем 2017 года — на 5,7%.

Такім чынам, зарплата чыноўнікаў органаў дзяржкіравання ў верасні перавысіла зарплату бюджэтнікаў у 1,7 разу, сярэднюю па краіне — у 1,3 разу.

Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата бюджэтнікаў паводле вынікаў дзевяці месяцаў склала 597,5 рубля, у верасні — 636 рублёў, што на 36,1 рубля (або на 6%) больш, чым у жніўні.

Намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата ў цэлым па краіне ў студзені—верасні склала 789,9 рубля, у тым ліку ў верасні — 831,3 рубля. Гэта на 13,1 рубля (на 1,6%) менш, чым у жніўні.

Згодна са звесткамі афіцыйнай статыстыкі, у верасні ў сферы дзяржкіравання было занята 66 тысяч 572 чалавекі (летась — 72.723 чалавекі).

У каментары БелаПАН дацэнт Міжнароднага ўніверсітэта «МІТСО» кандыдат эканамічных навук Вячаслаў Ярашэвіч адзначыў, што такі рост можа быць звязаны з аптымізацыяй колькаснага складу дзяржапарату. «Камусьці гэты працэс прыносіць значную прыбаўку да зарплаты, іншым — пошук новага месца працы. Скарачэнне дзяржслужачых заахвочваецца на высокім узроўні», — адзначыў Ярашэвіч.

Тое ж самае, дадаў ён, адбываецца і ў іншых структурах. «Напрыклад, ва ўніверсітэтах скарачаюць кафедры і стаўкі, што прыводзіць да росту зарплат кіраўнікоў. А звычайны бюджэтнікі застаюцца на тарыфнай сетцы, звязанай са стаўкай першага разраду, якая падымаецца ў апошнія гады рэдка і ўсяго на 3-5%», — сказаў Ярашэвіч.

Кіраўнік Навукова-даследчага цэнтра Мізеса Яраслаў Раманчук, у сваю чаргу, адзначыў, што рост зарплат дзяржчыноўнікаў звязаны з выкананнем пастаўленай Аляксандрам Лукашэнкам задачы давесці сярэднюю зарплату да канца года да 1.000 рублёў.

«Можна гэта зрабіць, павялічыўшы адной афіцыйнай групе зарплату на 70%, а іншай — не павялічваць зусім. У сярэднім „усім па 500“ (долараў у эквіваленце. — БелаПАН.) і атрымаецца. Многія будуць рады з яшчэ большым запалам выконваць валавыя паказчыкі, а астатнія, хто не дасягнуў 500, павінны разумець, што падачак больш не будзе», — лічыць эксперт.

Ён звярнуў увагу на тое, што дзяржрасходы два гады запар застаюцца на ўзроўні 42-43% ад ВУП і не зніжаюцца. Ёсць яшчэ так званыя забалансавыя выдаткі (прыблізна 5% ВУП). «Мы не можам кантраляваць расходы ўсіх органаў дзяржкіравання, таму ім лёгка перакінуць з аднаго артыкула расходаў на іншы, у тым ліку на павышэнне зарплат. Яны будуць праядаць грошы, замест таго каб накіроўваць іх на развіццё», — мяркуе эканаміст.

Марына Носава
БелаПАН

100 КАСТРЫЧНІКУ

БЕЛАРУСЬ В ПЛЕНУ МЕРТВЕЧИНЫ

Споры о наследии Октябрьской революции (или переворота) — это вопрос не прошлого, а будущего нашей страны. Беларусь остается в капкане провального исторического эксперимента...

Да, по большому счету эпоха прошла. В советские времена красные даты в Минске отмечали многотысячными манифестациями, сегодня же официальное мероприятие — возложение цветов к большому черному монументу Ленина перед Домом правительства — собрало примерно тысячу человек на четверть часа. Потом публика быстро рассосалась.

Другой полюс отношения к дате, которая остается красной только в белорусском календаре (от нее отказалась даже Россия, где, собственно, и выстрелила «Аврора» сто лет назад), — это перформанс в Березовке Лидского района. Там к памятнику Ленину возложили венок, «украшенный» черепами, колючей проволокой и снабженный пожеланием «Гары ў пекле, кат» («Гори в аду, палач»).

Концептуальная битва

Дата дала разным деятелям и просто политизированной публике повод скрестить идейное оружие в концептуальной сече. Возбудились голоса как адептов созданного большевиками строя, так и тех, кто считает коммунизм абсолютным злом.

«Самое главное достояние — народовластие, социальная справедливость, дружба людей, помощь. Это то, что принес нам Октябрь. На этой основе народ СССР победил в Великой Отечественной войне и мы построили мощное социалистическое государство. Были недостатки, но они мизерны по сравнению с тем, чего мы достигли», — заявил сегодня на столичной площади Независимости (прежде — Ленина) председатель совета Компартии Беларуси Алексей Камай.

Этот набор доводов шаблонен, то и дело звучит из разных уст — и легко разбивается представителями другого лагеря.

Они, например, скажут, что одержимый паранойей Сталин выкосил перед войной цвет Красной армии — и победа далась не «благодаря», а «вопреки». А «мощное социалистическое государство», в котором не было туалетной бумаги, в итоге проиграло соревнование капитализму и расползлось по швам. СССР просто нет, колосс на глиняных ногах рухнул — вот вам главное доказательство неконкурентоспособности коммунизма...

К чему привел совок в мозгах

Здешняя топонимика, набор памятников в городах — это сплошной Хэллоуин. Увековечены кровавые, демонические фигуры. Но это только наружная атрибутика. Печальнее то, что и руководство страны, и немалая часть населения — в ментальном плену ушедшей эпохи. Мертвечина держит страну, общество в своих объятиях.

Наследие тоталитарного строя аукнулось тем, что после развала СССР люди оказались не готовыми к свободе. Потянуло назад, в убогий рай с докторской колбасой по 2 рубля 20 копеек (очереди за ней, равно как и за прочими дефицитами, как-то быстро забылись).

Именно совок в мозгах привел к власти в 1994 году Александра Лукашенко. Ну а тот, кажется, довольно искренне взялся возвращать Беларусь в «светлое прошлое». В итоге страна потеряла и продолжает терять драгоценное историческое время.

В поздравлении по поводу сегодняшней даты Лукашенко отметил, что «сформированные в период Советского Союза социально-экономические принципы легли в основу развития промышленного, научного, сельскохозяйственного и социального потенциала современного белорусского государства».

По-своему это верно. В Беларуси, как и в СССР, составляются пятилетние планы, доминирует государственная собственность. Но в советские времена пятилетки, пусть и дорогой ценой, в основном выполнялись, белорусское же правительство минувшую пятилетку позорно провалило, а на нынешнюю запланировало фактически топтание на месте. Массив же госсобственности стал капитальным тормозом развития страны. Многие предприятия работают неэффективно, держатся на вливаниях казенных денег. Это предприятия-зомби.

Торжество карго-культа

Страх белорусской правящей верхушки, изрядной части номенклатуры идет от незнания рынка и смутного предчувствия, что его наступление сделает ненужной всю нынешнюю дирижистскую систему, основанную на том, что вождь ездит на квадроцикле по полям, лично щупая колоски, периодически собирает «крепких хозяйственников» на совещания и пугает жесточайшим спросом. А начальники поменьше пугают своих подчиненных. При том что в действительно развитых, богатых странах экономика каким-то непостижимым для наследников Октября образом функционирует без селекторных совещаний.

Из советских времен — и борьба с тунеядством, рецидив которой привел к появлению печально известного декрета № 3. Спровоцировавшего, в свою очередь, массовые протесты в феврале — марте. Власти получили капитальный батхерт на ровном месте, а масса увидела, насколько «народен» режим, выводящий против мирного населения легионы «робокопов» в тяжелых латах и с водяными пушками за спиной.

К слову, о так любимом наследниками Октября лозунге народовластия. Да, в 1994-м Лукашенко выиграл на довольно демократичных выборах. Но потом выборы были превращены в карго-культ, точь-в-точь как при советской власти. Периодически люди приходят в школы, опускают кусочки бумаги в красные ящики, однако к вопросу власти это не имеет отношения. Она взята раз и навсегда и удерживается совершенно иными способами.

Наконец, именно москвоцентризм и тяготение к реставрации советской системы определили выбор Лукашенко в пользу «братской интеграции» с Россией. Это обернулось «диким креном», порочность которого в минуты откровенности был вынужден признавать и сам белорусский президент.

Российские субсидии оказались коварным наркотиком. Да, был период кайфа, разнузданного популизма, когда можно было повышать зарплаты без трансформации советского производственного потенциала, но при этом Беларусь упустила золотое время для реформ. А зависимость от Москвы стала угрозой суверенитету.

Курс на задворки развитого мира

Было бы неверно сводить проблемы развития Беларуси к тому, что вот, правящая верхушка уцепилась за власть и ничего не хочет менять. Изрядная часть населения тоже ничего не хочет менять. Даже среди тех, кто при социологических опросах высказывается за реформы, немалая доля респондентов, для которых реформы — это усиление роли государства в экономике.

Главная проблема ведь не в том, что дата 7 ноября остается праздником в официальном календаре. Проблема в том, что Беларусь де-факто остается в капкане провального исторического эксперимента.

Наследие совка ведь еще и в том, что глубоко пустил корни патернализм. Велик страх потерять казенное рабочее место, пусть и со скудной зарплатой. При настоящем рынке — да, придется переучиваться, повышать квалификацию, конкурировать. Так, может, ну его к чертям собачьим?

«...Идея, что рынок нас спасет, что капитализм — это единственная система, которая может сегодня существовать, полная чушь», — рассуждал Лукашенко пару месяцев назад, принимая в Минске Геннадия Зюганова и стараясь пролить бальзам на душу лидера российских коммунистов.

Но все эти словесные выверты разбиваются о железный факт: нет ни одного примера, чтобы без рынка создали по-настоящему богатую, развитую страну. Апофеоз коммунистической системы — это сегодняшняя Северная Корея.

У нас до этого не дойдет, но вот вечное место на задворках развитого мира Беларуси светит вполне реально.

(сокращено)

Александр Класковский
БЕЛАПАН

Заснавальнік і рэдактар:
Гаравы Леанід Антонавіч

Адрас рэдакцыі: 211573, г. Гарадок, вул. Гагарына, д.30Б, кв.16. E-mail: 250318@list.ru
Тэл. 8-02139-5-08-52, маб. + 375(29)6723842 (V),
Газета выдаецца з сакавіка 1998 г.

Падпісана да друку 16.11.2017 у 18.10
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца на абсталяванні аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.